*А.М. Емялёва,*
*старшы выкладчык кафедры беларускай*
*і сусветнай мастацкай культуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# РОЛЯ МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ПРАВАСЛАЎНЫХ УСТАНОВАХ ВІЦЕБСКА XIX ст. (па матэрыялах выдання «Полоцкие епархиальные ведомости»)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Некалькі гадоў таму ў аддзеле рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь давялося пазнаёміцца са звычайным, на першы погляд, непрыкметным выданнем XIX ст., часопісам «Полоцкие епархиальные ведомости». У той час дакладна не было вядома, якога роду матэрыял будзе атрыманы і нават ці атрыманы ён будзе наогул. Але старадрукаваныя старонкі, паслядоўнасць якіх была часта пераблытана, жаўтаваты колер тоўстай паперы, ды і сам пах гісторыі, які ўтрымлівалі даволі аб'ёмныя шэрыя тамы выдання, неяк асабліва зачароўвалі і прываблівалі. Самае цікавае ў рабоце з такімі матэрыяламі заключаецца ў тым, што, калі шукаеш неабходныя звесткі ці факты, міжволі пачынаеш зацікаўлівацца, на першы погляд, не патрэбнымі і непрыкметнымі для работы дэталямі. Але гэтыя дробязі глыбока западаюць у памяць і ў неабходны момант ствараюць асобны настрой, які дапамагае злучаць далёкія (як па раскіданасці ў тэксце часопіса, так і ў гістарычнай прасторы) факты.

У выданні ўтрымліваліся вельмі сціплыя сведчанні па развіцці музычнай адукацыі і выхавання, што тычылася Віцебска. Але нават некалькі сказаў на працягу тысячастаронкавых тамоў дазвалялі меркаваць, што пошук трэба працягваць. Далейшае вывучэнне матэрыялаў часопіса за 43 гады яго існавання (з 1874 па 1917 г.) перайшло ў залу Аддзела беларускай культуры. Раскіданыя факты паступова пачыналі аб'ядноўвацца і выстройвацца ў сістэму, ва ўяўленнях узнікалі маляўнічыя пейзажы старажытнага Віцебска XIX ст., адлюстраваныя ў малюнках Ю. Пешкі, Н. Орды. З аднаго боку, горад паўставаў перад вачыма як развіты культурны цэнтр са старажытнымі традыцыямі архітэктуры, жывапісу, музычнага мастацтва.

З другога боку, цяжкае матэрыяльнае становішча сярэдніх і ніжэйшых слаёў насельніцтва, частыя эпідэміі, голад дазвалялі

бачыць і ацэньваць некаторыя факты па асобнаму. Напрыклад, для нас зусім звычайна гучыць інфармацыя аб дзейнасці выкладчыкаў спеваў таго часу (дыяканаў, псаломшчыкаў) у царкоўна-прыходскіх школах. Але гэта інфармацыя набывае новае адценне, калі чытаеш, як гэтыя выкладчыкі ішлі многія кіламетры, часта пеша, бо дарогі былі дрэнныя і размытыя дажджамі, дзеля таго, каб вучні маглі атрымаць цікавыя ім веды, каб убачыць жаданую іскрынку ўдзячнасці ў іх вачах. Або яшчэ прыклад, як семінарысты, якія былі ўвогуле вельмі вясёлымі, шчырымі і выхаванымі людзьмі, не вытрымлівалі ўмоў існавання і ўцякалі з семінарыі да бацькоў. У справаздачах вучэбных саветаў існавала статыстыка смяротнасці семінарыстаў з-за эпідэмій тыфу, халеры і голаду.

Часта атрымоўвалася, каб адсачыць якую-небудзь тэндэнцыю ў развіцці музычнай адукацыі і выхавання сярод навучэнцаў праваслаўных установ, неабходна было знайсці і супаставіць лічбы або факты многіх тамоў часопіса, якія знаходзіліся ў значнай часавай аддаленасці паміж сабой. Вельмі абнадзейвала і радавала ўзнікненне ў тэкстах кароткай інфармацыі аб існаванні фабрыкі музычных інструментаў або аб прыватных майстрах па вырабе музычных інструментаў. Тым больш, што такія дадзеныя знаходзіліся сярод бясконцых каштарысаў і аб'яў аб дзейнічанні свечных заводаў, мылаваран, фабрык па вырабе лёну, пянькі і іншых гаспадарчых рэчаў.

Чытаючы пажухлыя, часам нікім не кранутыя дагэтуль старонкі часопіса, пачынаеш разумець, які гонар адчувалі навучэнцы, калі атрымлівалі грашовыя прэміі за поспехі ў вучобе, бо гэтыя знакі прызнання дазвалялі набываць дадатковыя веды або купляць музычныя інструменты у той нялёгкі час, калі вучні адчувалі вялікую патрэбу ў звычайным матэрыяльным забеспячэнні. І ўсё ж такі некаторыя навучэнцы самаадданa пагаджаліся з цяжкімі матэрыяльнымі ўмовамі, каб папоўніць свой багаж ведаў і павысіць прафесійнае майстэрства. Адразу адчуваецца каштоўнасць такіх сціплых сведчанняў, калі аўтары артыкулаў часопіса адзначалі высокі ўзровень выступленняў навучэнцаў, якія з задавальненнем наведвала і самая высокашаноўная публіка губернскага горада.

У гісторыі культуры любога горада ёсць як вядомыя старонкі, так і найменш даследаваныя, якія з'яўляюцца, магчыма, не такімі значнымі і глабальнымі для культуры краіны ў цэлым, але без вывучэння і асэнсавання якіх часам цяжка ўявіць суцэльную карціну гісторыі музычнага мастацтва. З адкрыццём такіх старонак,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што засноўваюцца на архіўных крыніцах, паступова ствараецца цэлая структурная сістэма поглядаў і ўяўленняў, якія уключаюць у сябе як свецкія, так і хрысціянскія мастацка-эстэтычныя пазіцыі. Факты развіцця хрысціянскай культуры былі адлюстраваны ў перыядычным друку, які да некаторага часу не быў запатрабаваны. У выніку гэтага шмат якія з'явы з гісторыі музычнай культуры ставіліся наперад, другія ж, не менш значныя, недаацэньваліся. Таму руплівае і шматбаковае вывучэнне, асэнсаванне і супастаўленне такіх гістарычных фактаў, вызначэнне ў іх стракатасці агульнага ствараюць арганічную сістэму мастацкага факта і дыялектыку музычна-гістарычнага працэсу ў цэлым.

Зразумець сэнс з'яў мастацтва таго ці іншага часу азначае разабрацца ў сутнасці іх і асэнсаваць тое, што было некалі па-сапраўднаму актуальным, адпавядала задачам мастацкага жыцця. Тым больш, што сучаснае духоўнае жыццё застаўляе нас па-новаму зірнуць на мінулае. Шматбаковае вывучэнне гісторыі, разуменне дыялектыкі музычна-гістарычнага працэсу дапамагае пранікнуць у сутнасць сучаснай культуры.

Больш глыбокаму асэнсаванню з'яў, якія тычацца гісторыі музычнай культуры Віцебска XIX ст., дапамагаюць матэрыялы перыядычных выданняў таго часу. Каштоўныя, але малавядомыя факты дазваляюць аднаўляць карціну музычнага жыцця горада, у тым ліку на аснове крытычнага матэрыялу адзінкавых публікацый у газетах і часопісах. Выданне «Полоцкие епархиальные ведомости» і з'явілася для нас такой цікавай, нявывучанай гістарычнай крыніцай. Што ўяўляла сабой гэта выданне?

«Полоцкие епархиальные ведомости» выдаваліся ў Віцебску на рускай мове, з'уляліся штотыднёвым выданнем і прызначаліся для Полацкай праваслаўнай епархіі. Выданне мела афіцыйны і неафіцыйны аддзелы: у афіцыйным аддзеле друкаваліся пастановы і распараджэнні ўрада і мясцовых улад па царкоўных справах, рашэнні і справаздачы Сінода, аб'явы і распараджэнні кансісторыі. У неафіцыйным друкаваліся матэрыялы, прысвечаныя гісторыі і традыцыям праваслаўнай царквы на Віцебшчыне, гісторыі будавання асобных храмаў і манастыроў, біяграфічныя нарысы, рэцэнзіі на асобныя працы і агляды друку па пытаннях гісторыі і культуры, агляды і рэкламы царкоўнай і свецкай літаратуры, матэрыялы, прысвечаныя праблемам развіцця народнай адукацыі на Віцебшчыне (у тым ліку і музычнай).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выданні разам з праблемамі грамадскага жыцця былі адлюстраваны задачы, якія тычыліся творчых працэсаў айчыннай музыкі, шляхоў яе развіцця, абагульнення стылёвых тэндэнцый у творчасці кампазітараў, выканаўцаў, аналізу музычнай дзейнасці праваслаўных устаноў Віцебска і Полацка (царкоўнапрыходскія школы, духоўныя вучылішчы і семінарыя). Таксама разглядаліся пытанні і праблемы музычнага рэпертуару і выканаўчага майстэрства, тэарэтыка-метадалагічныя асновы навучання музычным дысцыплінам, праблемы падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў-музыкантаў, высвятляліся асноўныя тэндэнцыі ў дзейнасці праваслаўных культавых устаноў. Публікацыі садзейнічалі актыўнаму далучэнню слухачоў розных саслоўяў да класічнай музыкі, рыхтавалі іх да музычнага ўспрымання твораў, дапамагалі разабрацца ў розных праблемах музычнага мастацтва.

У многіх артыкулах канстатаваліся меркаванні пра павышэнне ўзроўню мастацкай патрабавальнасці публікі да праграм канцэртаў, да выканальніцкага майстэрства і, наогул, да айчыннай культуры. На старонках выдання аб’яўлялася аб арганізацыі канцэртаў у Віцебску, аб новых нотных выданнях, аб продажы музычных інструментаў. Асаблівае значэнне належала публікацыям аб канцэртнай дзейнасці айчынных музычных калектываў у замежжы. У іх адчувалася пачуццё гонару за нашу культуру, што, безумоўна, спрыяла ўзмацненню цікавасці грамадскасці Захаду да творчасці кампазітараў і выканаўцаў і прызнанню дасягненняў айчыннай выканальніцкай школы. Асноўнай задачай артыкулаў было жаданне актыўна ўздзейнічаць на духоўнае жыццё народа, звярнуць увагу на актуальныя пытанні ў сферы музычнага мастацтва.

На старонках выдання закранaлася адна з галоўных праблем таго часу – музычная адукацыя і выхаванне сярод навучэнцаў царкоўнапрыходскіх школ, духоўных вучылішч і семінарый. Мы паспрабавалі абагульніць і сістэматызаваць праблемы, якія тычыліся асноўных напрамкаў музычнай дзейнасці гэтых праваслаўных устаноў. Работа па арганізацыі музычнага выхавання была накіравана на вывучэнне перш за ўсё музычнай граматы, на паступовае авалодванне прафесійнымі прыёмамі царкоўнапеўчага мастацтва, на падрыхтоўку кваліфікаваных выкладчыкаў, выканаўцаў-спевакоў і інструменталістаў, на ўдасканаленне тэарэтыка-метадалагічных асноў арганізацыі вучэбнага працэсу. Трэба дадаць, што царква ўкладвала значныя сродкі ў арганізацыю дзейнасці сваіх навучальных устаноў, якія нараўне з адукацыйнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

установамі свецкага тыпу (гімназіі, вучылішчы, прыватныя пансіёны, школы) ажыццяўлялі падрыхтоўку прафесіянальных музыкантаў для хароў і аркестраў і ў якіх таксама закладваліся асновы музычнай адукацыі і выканальніцтва. Царква ўяўляла сабой адзін са значных культурных цэнтраў, які канцэнтраваў вакол сябе музычна-выканальніцкія, педагагічныя і вытворчыя сілы: кампазітараў, вакалістаў, інструменталістаў, выкладчыкаў і музычных майстроў, яна ў сваёй дзейнасці садзейнічала захаванню і развіццю традыцый прафесійнага музычнага мастацтва на тэрыторыі Беларусі.

Першапачатковай ступенню ў адукацыйнай сістэме праваслаўных устаноў з'яўляліся царкоўна-прыходскія школы. Напрыканцы XIX ст. у Віцебску існавала каля 30 школ, кожная налічвала ў сярэднім па 20 вучняў. З іх 2,2% складалі дарослыя мужчыны, 20% – вучні школьнага ўзросту і толькі 1,3% займала жаночае насельніцтва. Вывучэнне музыкі і спеваў у гэтых школах мела вельмі важнае значэнне ў справе выхавання і фарміравання культурнага ўзроўню вучняў, якім давалі асновы музычных ведаў і прывівалі цікавасць да мастацтва наогул. Разам са спяваннем падчас хрысціянскіх службаў хоры навучэнцаў выступалі і ў канцэртах, якія з задавальненнем наведвала мясцовая публіка, што, натуральна, спрыяла развіццю мастацкага густу сярод слухачоў розных саслоўяў і канфесійных веравызнанняў. Навучанне ў царкоўнапрыходскіх школах мела важнае значэнне для духоўнага і музычнага выхавання насельніцтва Віцебска XIX ст., бо яно давала вучням магчымасць атрымліваць пачатковую адукацыю і пашыраць кола тэарэтычных і практычных ведаў, а спевы садзейнічалі эстэтычнаму і інтэлектуальнаму развіццю навучэнцаў.

Другой, больш высокай ступенню ў музычнай адукацыйнай сістэме праваслаўных устаноў Віцебска з'яўлялася дзейнасць духоўнай семінарыі, якая пачала сваё існаванне ў 1806 г. у Полацку, а з 1856 г. была пераведзена у Віцебск. Першы рэктар семінарыі Сергі Асоўскі надаваў вялікую значнасць музычна-эстэтычнаму выхаванню семінарыстаў, якія добра спявалі духоўныя і свецкія музычныя творы і, акрамя гэтага, мелі нядрэнны аркестр. На працягу вучэбнага года навучалася больш за 200 чалавек, а з 1886 г. пры семінарыі пачала існаваць пачатковая аднакласная ўзорная школа, курс навучання ў якой складаў два гады. Семінарыя прадстаўляла даволі своеасаблівы ўзор сярэдняй навучальнай установы з характэрна выяўленым свецкім напрамкам,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

які быў не на шкоду спецыяльнай духоўнай адукацыі. У абавязкі настаўніка ўваходзіла навучанне спевам па трапарах, кандаках, стыхірах, дагматыках, дзеля чаго запрашаліся настаўнікі-музыканты з гімназій і іншых навучальных устаноў. Хор семінарыстаў складаўся са 150 чалавек, якія падзяляліся на два клірасы. У 1880-х гг. хорам кіраваў таленавіты знаўца спеваў В. А. Залатніцкі. Аб даволі высокім ўзроўні падрыхтоўкі семінарыстаў сведчыць той факт, што, напрыклад, у 1885 г. пяць студэнтаў паступілі ў Санкт-Пецярбургскую духоўную акадэмію. Трэба асобна адзначыць, што ў лік уступных іспытаў уваходзіў абавязковы іспыт па спевах. Гэта дае падставы меркаваць, што музычнае навучанне ў семінарыі знаходзілася на даволі высокім узроўні, як таго патрабавала праграма вышэйшай навучальнай установы – акадэміі.

Сярод іншых праваслаўных устаноў Віцебска XIX ст., якія таксама можна аднесці да сярэдняга звяна ў адукацыйнай сістэме і ў якіх таксама надавалася значная ўвага музычнай адукацыі, захоўваліся і развіваліся традыцыі пеўчага і выканальніцкага мастацтва, належыць назваць духоўныя вучылішчы. У Віцебску таго часу было два вучылішчы – мужчынскае і жаночае. Мужчынскае духоўнае вучылішча пачало сваю дзейнасць у 1810 г. Тэрмін навучання складаў чатыры гады, а пасля 1854 г. – шэсць гадоў. Колькасць вучняў на працягу існавання семінарыі значна павялічылася – ад 15 чалавек у першыя гады да 144. У вучылішчы былі створаны два харавыя калектывы, якія карысталіся поспехам сярод насельніцтва, бо валодалі добрай прафесіянальнай падрыхтоўкай і выканальніцкай натхнёнасцю. Пры духоўным вучылішчы існавалі падрыхтоўчыя класы, дзе на працягу аднаго года навучаліся дзеці 9–11-гадовага ўзросту. Галоўная ўвага настаўнікаў накіроўвалася на пастаноўку голасу, выхаванне музычнага слыху і якаснае інтанаванне. Сярод вядучых выкладчыкаў спеваў і музыкі можна назваць С. А. Гнядоўскага, А. М. Серабраніцкага, С. Я. Вараб'ёва, якія былі таленавітымі майстрамі сваёй справы і значна спрыялі закладванню і развіццю асноўных выканальніцкіх прынцыпаў у дадзенай установе.

Жаночае духоўнае вучылішча (створана ў 1864 г.) таксама пакінула значны след у музычнай культуры Віцебска. Яно рыхтавала выхаванак да педагагічнай дзейнасці ў пачатковых народных вучылішчах і царкоўнапрыходскіх школах. Многія вучаніцы, акрамя валодання мастацтвам спеваў, па жаданні маглі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучыцца ігры на музычных інструментах. З 1892 г. у вучылішчы было дазволена, у выглядзе спробы, выкладанне ігры на скрыпцы за асобную плату. Заняткі праводзілі выкладчыкі А. П. Пальчынскі, А. Нігоф, М. Мельнікава і А. Шымакоўская. Вучаніцы сярэдніх і старэйшых класаў абавязкова пелі на богаслужэннях, прымалі актыўны ўдзел у святочных літургіях і малебнах, рэпертуар якіх складалі канцэрты Д. С. Бартнянскага, А. Л. Ведэля, інструментальная музыка М. А. Балакірава, Е. С. Азеева, М. І. Глінкі. На музычных вечарынах гучалі хоры з опер П. І. Чайкоўскага, А. С. Даргамыжскага, К. М. Вэбера. Некаторыя вучаніцы нават выконвалі і асабістыя кампазітарскія творы, што сведчыць аб даволі высокім узроўні і зацікаўленасці іх у авалодванні як мага большай колькасцю музычных дысцыплін і інструментаў. Пры вучылішчы існавала царкоўнапрыходская школа для засваення практычных педагагічных навыкаў і вядзення самастойных урокаў навучэнкамі.

Такім чынам, усе гэтыя факты сведчаць аб даволі высокім ўзроўні выкладання музычных дысцыплін і прафесіяналізме выканаўцаў, што, зразумела, рабіла гонар духоўнаму вучылішчу і дазваляла меркаваць аб гэтай навучальнай установе, як аб адным з дзейсных цэнтраў музычнага выхавання у Віцебску XIX ст.

Выданне «Полоцкие епархиальные ведомости» дало нам магчымасць аб’яднаць у адну сістэму дзейнасць прадстаўленых навучальных устаноў і вызначыць, што царкоўнапрыходскія школы, семінарыі, духоўныя вучылішчы актыўна садзейнічалі мастацка-эстэтычнай адукацыі насельніцтва Віцебска і адыгрывалі значную ролю не толькі ў павышэнні культурнага ўзроўню навучэнцаў, але і ў росце прафесійнага майстэрства выкладчыкаў. Яны спрыялі папулярызацыі музычнага мастацтва наогул. У гэтых установах захоўваліся і атрымлівалі развіццё прынцыпы вакальна-харавога і інструментальнага выканальніцтва, якія з’яўляліся асновай для далейшага разгортвання музычнага руху на Віцебшчыне. Творчая і асветніцкая дзейнасць малавядомых людзей, музычных калектываў, навучальных устаноў пакінула, магчыма, невялікі, але каштоўны след у гісторыі культуры аднаго горада. Для стварэння агульнай карціны культурнай спадчыны рэгіёна іх існаванне з’яўляецца значным і важным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ